## Бібліяграфічны спіс

1. Васючэнка, П. Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. Васючэнка. – Мінск: Галіяфы, 2009. – 200 с.
2. Васючэнка, П. Літаратурны твор як шыфр. Нашаніўская традыцыя іншасказу і яе актуалізацыя ў сучаснай беларускай літаратуры / П. Васючэнка // Произведение искусства – предмет анализа критика: сб. науч. тр. / под ред. Т. Д. Орловой. – Минск: БГУ, 2009. – Вып. 1. – С. 110–115.
3. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларус. паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 246 с.
4. Гніламёдаў, У. В. Янка Купала: новы погляд / У. В. Гніламёдаў. – Мінск: Нар. асвета, 1995. – 176 с.
5. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995–2003. – Т. 1–6. (Тут і далей цытаты з мастацкіх твораў падаюцца паводле гэтага выдання з пазначэннем адпаведнага тома і старонкі.)
6. Лебедева, Т. Г. Художественное время и предвидение в прозе Ю. Трифонова / Т. Г. Лебедева // Мировоззренческие вопросы предвидения и времени: межвуз. науч. сб. / редкол.: В. Н. Ярская (отв. ред.) [и др.]. – Саратов: Изд-во Сарат. ун-та, 1986. – С. 139–147.
7. Нагапетян, К. Ж. Языковое бытие и исторические метаморфозы миропроговаривания русской культуры: автореф. дис. … канд. филос. наук: 09.00.13 / К. Ж. Нагапетян. – Омск, 2016. – 25 с.


*УДК 821.161.3(092 Я. Колас)*

# МАСТАЦКАЯ ДЭТАЛЬ ЯК ПРЫЁМ ПСІХАЛАГІЗМУ Ў ПРОЗЕ ЯКУБА КОЛАСА

**Т. М. Тарасава**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*tamaratarasava@gmail.com*

Разглядаецца роля і функцыя мастацкай дэталі ў «малой» прозе Якуба Коласа (на прыкладзе апавяданняў «Адукацыя» і «Хатка над балотцам»). Аналіз дэталяў раскрыў талент Коласа-апавядальніка, змястоўнасць яго малой формы, здольнасць пісьменніка ў невялікім творы паставіць не толькі маштабную праблему сацыяльнага плана, але і паказаць, як унутраны свет чалавека ўвасоблены праз карціны свету знешняга.

*Ключавыя словы:* мастацкая дэталь; апавяданні Якуба Коласа; псіхалагізм; мікрадэталь; мікрасітуацыя.

# THE ARTISTIC DETAIL AS A METHOD OF PSYCHOLOGISM IN THE PROSE OF YAKUB KOLAS

**T. M. Tarasava**

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*Minsk, Republic of Belarus*
*tamaratarasava@gmail.com*

The role and function of the artistic detail in Yakub Kolas' stories (on the example of the stories "Education" and "The House over the Swamp") is considered in the article.

The analysis of the details revealed the talent of Kolas the storyteller, the depth of his stories, the ability of a writer to set large-scale social problems. The writer could also show how the inner world of a man is embodied through the pictures of the external world.

*Key words:* artistic detail; stories by Yakub Kolas; psychologism; microdetail; microsituation.

Мастацкая спадчына Якуба Коласа сведчыць аб прыхільнасці мастака да прынцыпаў класічнага рэалізму. Традыцыі сацыяльна-псіхалагічнай прозы XIX ст. выразна прысутнічаюць у творах пісьменніка, але Колас – творца XX ст., і ён не мог не ўвасобіць філасофскую, псіхалагічную і сацыяльную спецыфіку эпохі. Класічны сацыяльна-псіхалагічны рэалізм трансфармуецца пад пяром беларускага пісьменніка. Вядома, гэтая трансфармацыя не такая радыкальная, як заходнееўрапейская, але істотная для нацыянальнай прозы, калі ўлічваць фігуру і маштаб дзейнасці Якуба Коласа. Спасцігнуць асноўныя законы, якія кіруюць грамадствам, патаемныя спружыны яго руху, асэнсаваць і зразумець жывую гісторыю зменлівай эпохі – менавіта такія задачы ставіў перад сабой пісьменнік у мастацтве. Глыбіня філасофскага роздуму аднаго з выдатных майстроў слова над быційнымі праблемамі сведчыць аб важнасці і неабходнасці заглыблення ў нетры чалавечай псіхікі, выяўлення сувязяў душы чалавека не толькі з соцыумам, але і з прыродай як элементам універсуму.

Апавяданне ў 20–30-я гг. мінулага стагоддзя – жанр даволі распаўсюджаны ў творчасці пісьменніка. І гэта невыпадкова, бо жанравая форма апавядання як «…способ мышления, определяемый в своих параметрах особенностями духовного мира личности» [1, с. 82], выяўляла спецыфіку супярэчнасцей першага савецкага дзесяцігоддзя і калектывізацыі. Апавяданне дэманструе супярэчнасці асколачна, тэзісна. Жанр «малой» прозы ў Коласа настолькі ёмісты, што здольны выяўляць светапоглядную канцэпцыю, філасофію часу і асобы. Яркім прыкладам можа быць апавяданне «Адукацыя» (Полымя, 1926, № 8). Сапраўды, твор уражвае глыбінёй і актуальнасцю ўзнятых праблем, майстэрствам увасаблення аўтарскай задумы, мастацкай дасканаласцю. «Адукацыя» наглядна паказвае змястоўнасць малой формы, талент Коласа-апавядальніка, яго здзіўляючую здольнасць у невялікім творы не толькі паставіць маштабную праблему сацыяльнага плана, але і паказаць, як унутраны свет чалавека ўвасоблены праз карціны свету знешняга.

Беларускі пісьменнік пазбягае прамога аўтарскага каментарыя, праз мікрадэталі знешняга свету дэвуалізуе пачуцці і эмоцыі герояў, не пажаданыя для адкрытага выяўлення. Беларускія літаратуразнаўцы (В. Жураўлёў, М. Мушынскі, І. Навуменка, М. Тычына і інш.) адзначалі псіхалагічную насычанасць і глыбокую змястоўнасць «малой» прозы пісьменніка. У звычайным, побытавым здарэнні (сямейным жыцці маладых, што толькі пабраліся) мастак убачыў і вялікую сацыяльную і духоўную праблему (у лёсе канкрэтнага чалавека – лёс пэўнай сацыяльнай групы, а фактычна – лёс усяго народа), і каштоўнасць, адзінкавасць, непаўторнасць прыватнага вопыту чалавека, калі важнае нараджаецца з малога, непрыкметнага, нязначнага на першы погляд.

Падзейная канва разгортваецца натуральна, нязмушана: малады хлопец, студэнт рабфака, Кузьма Лявуцкі закахаўся ў прыгожую дзяўчыну Насцю. Не атрымаўшы згоды Насціных бацькоў, якія жылі на хутары, аддаць замуж дзяўчыну ў адпаведнасці з патрабаваннямі новага часу, г. зн. без вянчання ў царкве, Кузьма так званымі сілавымі метадамі вырашае невырашальную праблему: ён выкрадае Насцю ў бацькоў. Крадзёж удаўся, бо Насця не супраціўлялася: ёй даспадобы быў Кузьма. Дробныя побытавыя дэталі (абутак, вопратка, хатняя мэбля, танальнасць голасу) становяцца сродкам пранікнення ў атмасферу сямейнага жыцця маладой пары і выяўлення іх характараў.

Намечаны канфлікт павінен быў бы адназначна вырашыцца на карысць героя як прадстаўніка новага пакалення моладзі, якое ішло ў жыццё, узброенае перадавым навуковым светапоглядам, новымі маральна-этычнымі прынцыпамі, новым стаўленнем да чалавека. Але сюжэтнае дзеянне завяршаецца поўным крахам героя, крахам метадаў, з дапамогай якіх ён збіраўся перавыхоўваць малапісьменную вясковую дзяўчыну, крахам усіх яго маральна-этычных установак.

Каштоўна тое, што аўтар апавядання пазбегнуў дыдактыкі, адкрытага маралізатарства, спрошчанага падыходу да вырашэння канфлікту. Гэтае вырашэнне дасягнута мастацкім шляхам, з дапамогай разнастайных вобразна-выяўленчых сродкаў. Адным з іх у багатай выяўленчай палітры пісьменніка з'яўляецца ёмістая дэталь, бытавая, псіхалагічная, якая ў тканіне твора набывае сімвалічнае значэнне, успрымаецца ў шырокім плане, нараджае багатыя асацыяцыі і аналогіі. Выкарыстоўвае такую дэталь аўтар апавядання па-майстэрску – непрыкметна, неназойліва. Так, кватэра Кузьмы была на ўскраіне горада, каля могілак. І гэты выбар месца жыхарства дужа паказальны для разумення характару героя, яго стаўлення да жыцця, да складаных праблем светабудовы. Героеў М. Гарэцкага цікавіла праблема замагільнага жыцця. Яны

хацелі ведаць, ці ёсць жыццё на іншых планетах, «адкуль гэта ўсё і чаму яно ўсё». «Перадавога» героя Коласа падобныя праблемы не краналі. Як перакананы матэрыяліст ён адкінуў усе складанасці, лічыў іх містыкай, папоўшчынай, цемрашальствам.

Па-майстэрску разгортвае пісьменнік сюжэтнае дзеянне, тонка раскрывае ўзаемаадносіны герояў, выяўляе асаблівасці іх псіхалогіі, рысы характару. Гэта бачна з рэакцыі Насці на магчымасць жыць «каля могілак»: ёй хочацца вярнуцца дамоў, на хутар, да бацькоў. Няхай яе намеры былі не зусім сур'ёзныя (а чаму б прыгожай дзяўчыне крыху не пакапрызіць, не задаць праграму будучых паводзін у сям'і, не паказаць маладому мужу, хто ў доме будзе за гаспадара?), але прамоўлена незадаволенасць была «…такім цвёрдым голасам, што Кузьма спалохаўся» [3, с. 107]. Кузьма ўступіў маладой жонцы.

Паказаўшы, што першая спрэчка герояў закончылася маленькай перамогай Насці, Якуб Колас і надалей не фарсіруе іх галоўнае сутыкненне, а пераканальна разгортвае канфлікт як натуральную праяву характараў Кузьмы і яго жонкі, іх светапогляднай арыентацыі. Пісьменнік упэўнена трымаецца побытавай глебы, але не ўпускае з-пад увагі і псіхалагічны аспект. Насця шчыра клапоціцца пра Кузьму. Яму прыемна было, вяртаючыся з працы, угледзець у хаце парадак, з'есці добры абед, але, заняты працай і вучобай, Кузьма не надаваў вялікага значэння бытавым дробязям: чаму Насці то венік патрэбен, то гаршчок, то міска, то люстэрка.

Галоўным жа аб'ектам, вакол якога разгарэлася спрэчка, аказаўся шынель: «Шынель, праўда, стары, выцерты і забруджаны. У гэтым шынялі ён ваяваў тры гады, прайшоў Польшчу з канца ў канец...» [3, с. 108]. У вобразнай сістэме твора гэтая дэталь выступае як рэчавая прыкмета часоў грамадзянскай вайны. І Кузьма псіхалагічна застаўся ў тым часе; ён гатовы перанесці нормы той, як яму здаецца, прыгожай, гераічнай эпохі ў новае жыццё, мірнае, працоўнае, але «адсталая» хутаранка і розумам, і інтуіцыяй не прымае гэтых ваяўніча-агрэсіўных ідэалаў. Тагачасная эмблематыка здаецца ёй чужой, варожай жыццю, унутрана непрымальнай. Нездарма ж яна так негатыўна характарызуе Кузьму ў шынялі, абзывае яго «пудзілам»: «Не чалавек, а чучала!» [3, с. 108].

Шынель непрымальны для Насці не толькі таму, што асацыіруецца з вайной, з акопамі і з брудам: «А я не хачу, каб у нашай хаце бруд быў» [3, с. 109]. Брудны ж шынель мужа апраўдваў правамернасць бруду ў хаце. Насця ж, выхаваная на ўлонні прыроды, якраз і ўвасабляе нармальны, здаровы погляд на жыццё. Кузьма сам ставіць сябе ў пройгрышнае становішча, падрывае веру жонкі ў перспектыўнасць сваіх спраў: гаворыць адно (змагаецца за светлае, новае жыццё), а робіць супрацьлеглае (апраўдвае бруд і неахайнасць).

У якасці кульмінацыйнага моманту пры сутыкненні герояў Якуб Колас зноў жа выкарыстоўвае бытавую дэталь і мікрасітуацыю. Насці даспадобы прыйшоўся жаночы капялюшык, што належаў маладой жанчыне, у якой кватаравалі Лявуцкія. І яна вырашыла крыху пафарсіць у гарадскім убранні. А заадно і Кузьму падштурхнуць на рашучыя дзеянні – прымусіць яго паклапаціцца пра новую вопратку. Бытавая дэталь – капялюшык – у вобразнай сістэме твора набыла шматзначнае сэнсавае гучанне, па-першае, як антытэза чырвонаармейскаму шынялю, па-другое, як адзнака культурнага жыцця.

Пісьменнік уважліва сочыць за рэакцыяй героя ў сітуацыі, калі той убачыў жонку ў гарадскім уборы: «Адчыніў дзверы, ступіў крок і спыніўся, застыў, як слуп: стаіць Насця ўбраная, падвітая, падпудраная, на галаве капялюш, а на губах найчараўнейшая ўсмешка. Глядзіць на яе Кузьма, вочы яго халадзеюць, бровы ссоўваюцца, і ўсміхаецца горкай, абразлівай і зняважлівай усмешкай. Гэты злы і халодны погляд прыводзіць Насцю ў поўнае замяшанне. Ёй робіцца сорамна і страх як нялоўка, а разам з гэтым адчувае яна і горкую крыўду» [3, с. 119]. Чаму ж такім жорсткім, бязлітасным стаў Кузьма? Справа ў тым, што ён душой не ўспрымае прыгажосць: мэтавая ўстаноўка на ідэю перавыхавання безадносна да пачуццяў чалавека вытруціла з яго душы здольнасць разумець хараство. Тут сутыкнуліся два погляды на чалавека, дзве маральна-этычныя сістэмы: адна – натуральна-жыццёвая, другая – дагматычная, адарваная ад жыцця.

Развязка апавядання таксама пабудавана на рэчавай дэталі: даведаўшыся, што Насця ў знак пратэсту супраць прымусовай адукацыі, супраць абразлівых для яе адносін пайшла ў прочкі (заўважым: яна вяртаецца да бацькоў, на хутар, г. зн. у нармальнае асяроддзе, дзе няма месца гвалту і прымусу!), Кузьма купляе бобрыкавае паліто і – для пакрыўджанай жонкі – чырвоную

кофту. Гэтым герой прызнае сваё паражэнне. Ён пагаджаецца з тым, што ягоная сістэма навучання, ягоныя маральна-этычныя ўстаноўкі нежыццёвыя. А гэта наводзіла на сур'ёзныя роздумы адносна таго ладу, які гэту сістэму спарадзіў і культываваў.

Адметную ролю бытавая дэталь адыгрывае ў «малой» прозе, жанравыя асаблівасці якой стрымліваюць маштабны (г. зн. у шматлікіх сувязях і пераходах) паказ жыцця. Але малая форма «…не освобождает вас от большого содержания» [4, с. 417]. Рэчавая дэталь дапамагае пранікнуць у сутнасць з'явы, характару, у сэнс чалавечага існавання. В. Халізеў адзначае: «Литература XX века ознаменовалась небывало широким использованием образов внешнего мира не только как атрибутов бытовой обстановки, среды обитания людей, но и (прежде всего!) как предметов, органически сращенных с внутренней жизнью человека и имеющих при этом значение символическое: и психологическое, и "бытийное", "онтологическое"» [5, с. 205].

Коласу-апавядальніку не ўласціва мудрагелістасць стылю, доўгія апісанні псіхалагічнага стану персанажаў. Сакрэт яго псіхалагічнай глыбіні – у характары спалучэння рэчавых дэталяў. Якуб Колас умее так дапасоўваць дэталь да дэталі, што гэта робіць малюнак больш аб'ёмным, адбываецца так званае «панараміраванне падзей» (Л. Анінскі). Коласава бытавая рэч стварае адмысловую шчыльнасць тэксту, у якім герой, не пазбаўлены сваіх індывідуальных рыс, паўстае як тып, дэтэрмінаваны ў рэалістычным кантэксце адпаведнымі параметрамі нацыянальна-гістарычнага быцця. Дакладнасць «попадания в характер» абумоўлена майстэрствам Коласа-апавядальніка заўважаць прадметныя дэталі навакольнага свету, здольныя ўвасабляць душэўныя і духоўныя памкненні героя.

У апавяданні «Хатка над балотцам» (Полымя, № 1, 1927) і характары, і сюжэт, і пейзажны малюнак – усё рэльефна. На фоне скрупулёзна дакладных дэталяў Колас выпісвае важны дыялог душ герояў. Раскіданыя ў тэксце рэчавыя дэталі ажыўляюць малюнак, робяць яго панарамным. Дзівосны прыродны пейзаж наваколля кантрастуе з запусценнем, убоствам усіх будынкаў на падворку. Якуб Колас у апавяданні татальна іранічны. Аўтарская іронія схавана ў памяншальна-ласкальнай форме рэчавай дэталі, якая стварае ўражанне крохкасці, лялечнасці, ілюзорнасці. Іранічныя адносіны да персанажаў, афармленыя праз памяншальна-ласкальную форму прадметнай дэталі, сведчаць аб ілюзорнасці іх цяперашняга існавання і цьмянай будучыні герояў. Дакладнае апісанне знешняга выгляду хаткі наводзіць на думку аб яе гаспадарах. Ніхто з жыхароў гэтай хаткі не меў тут удачы, зазначае Колас, бо гаспадарамі яны не былі. Хатка для іх – проста будынак, а не дом. Трагічная іронія пісьменніка схавана ўнутры твора – у партрэтныя характарыстыкі герояў, парадыйныя мізансцэны.

Пан Зыгмусь і пані Даміцэля былі родам з Польшчы (з-пад Сувалак), аселі на Беларусі пасля бежанства ў час вайны ў Расію, гавораць «польска-руска-беларускім жаргонам». Героі маюць непрывабную знешнасць («…паскупілася прырода на хараство для іх, ды мала таго – яна пакрыўдзіла іх: у пані Даміцэлі хворыя ногі і каўтун на галаве, а пан Зыгмусь з'яўляецца як бы жывым аргументам вядомай тэорыі Дарвіна аб паходжанні чалавека» [3, с. 180]) і нявызначаны род заняткаў («Часамі пан Зыгмусь апісваўся горкім пралетарам, ...то выступаў як багаты чалавек, у якога быў свой маёнтак, свой дом і шыкарны сад, <...> то польскім настаўнікам, а часамі выступаў у ролі кантрабандыста» [3, с. 187–188]).

Зыгмусь і Даміцэля – лялечныя персанажы. Пра ўсё, што мае да іх дачыненне, Якуб Колас гаворыць у памяншальна-ласкальнай форме. Лялечныя людзі жывуць у такім жа лялечным прыгрэбнічку, спажываюць лялечныя рэчы: ручную цялежачку, мізэрненькую сякерку, гадуюць рабенькага япручка, мармычуць пад нос песеньку. Знешні лялечны выгляд герояў удала маскіруе іх драпежніцкую натуру. Захоп ажыццяўлялі ціха, паступова, непрыкметна.

Зямля і хатка паступова прыйшлі ў запусценне. Хатка і хлевушок нагадваюць пару жабракоў, кроквы і латы – голыя косці, «…кволенькі зруб калодзежа журботна скасіўся», «…гаротна пазірае комін над дзіраваю страхою хаткі, а драцяная агароджа ляжыць, …зачапіўшыся за бярозавыя колікі, таксама павырываныя з зямлі» [3, с. 208]. Бытавыя дэталі сведчаць аб трывожнай думцы Коласа наконт адчужанасці зямлі ад гаспадара. Прыбітая падкова на дзвярах ганачка становіцца эмблемай нерэалізаваных утульнасці і дабрабыту. «Деталь становится "стержнем психологической характеристики", "ядром характера"» [2, с. 407].

Апавяданне «Хатка над балотцам» стала яскравым узорам твора, дзе бытавая дэталь здольна выявіць суровую праўду жыцця, раскрыць унутраны свет героя і тым самым увасобіць значную мастацкую ідэю. Колас не прыглушае ў апавяданні сацыяльны пачатак, які фарміруе характар, але пры гэтым не адбываецца разбурэння натуральных чалавечых пачуццяў. Пісьменнік не раскрывае псіхалогію герояў праз аўтарскія разважанні; ён узнаўляе яе праз бытавую дэталь і мікрадэталь, здольныя імгненна раскрыць філасофію бачання свету героямі, іх псіхалагічныя механізмы. Менавіта дэталі надаюць твору, як адзначае Я. С. Добін, «желанную рельефность, законченность, предельную выразительность» [2, с. 303].

Насычанасць твораў бытавымі дэталямі, мікрасітуацыямі давала магчымасць аўтару бачыць не толькі рэальную, суровую праўду жыцця, але і ўнутраны свет герояў. Пісьменнік раскрываў іх псіхалогію праз мікрасітуацыі, мікрадэталі. Апошнія спрыялі візуалізацыі карціны свету цалкам, выяўлялі філасофію герояў, псіхалагічныя механізмы іх паводзін. Падрабязная дэталізацыя ў прозе мастака спрыяла таму, каб задумацца, наколькі шматаблічны чалавек і шматаблічны той, хто яго ўспрымае.

## Бібліяграфічны спіс


1. Андреев, А. Н. Методология литературоведения: пособ. для филол. специальностей вузов / А. Н. Андреев. – Минск: Дизайн ПРО, 2000. – 192 с.
2. Добин, Е. С. Сюжет и действительность. Искусство детали / Е. С. Добин. – Л.: Сов. писатель, Ленингр. отд., 1981. – 432 с.
3. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – Т. 6: Апавяданні; Раннія празаічныя творы; Пераклады. – 574 с.
4. Толстой, А. Н. Собрание сочинений: в 10 т. / А. Н. Толстой; редкол.: В. И. Баранов [и др.]. – М.: Худож. лит., 1986. – Т. 10: Публицистика; Рассказы Ивана Сударева. – 511 с.
5. Хализев, В. Е. Теория литературы: учеб. для вузов / В. Е. Хализев. – 2-е изд. – М.: Высш. шк., 2000. – 398 с.


*УДК 821.161.3(092 Я. Колас)*

# КУЛЬТУРА ЖЭСТА Ў ГЕРОЯЎ ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА «НА РОСТАНЯХ»

**Т. І. Шамякіна**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*shamyakina@tut.by*

На матэрыяле трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» закранаецца пытанне паказу сувязі жэстаў, мімікі герояў з іх выказваннямі. Разам узятыя яны дапамагаюць індывідуалізаваць персанажаў, ствараць непаўторныя характары.

*Ключавыя словы:* Якуб Колас; Лабановіч; Ядвіся; міміка; жэст; герой; партрэт.

# GESTURE CULTURE OF THE HEROES OF YAKUB KOLAS' TRILOGY "AT THE CROSSROADS"

**T. I. Shamyakina**

*Belarusian State University*
*Minsk, Republic of Belarus*
*shamyakina@tut.by*

On the material of the trilogy of Yakub Kolas "At the Crossroads" the issue of showing the connection of gestures, facial expressions of the characters with their statements is touched upon. Taken together, they help to individualize the characters, to create unique characters.

*Key words:* Yakub Kolas; Labanovich; Yadvisya; facial expressions; gesture, hero; portrait.